# СВЯТА ЗНОСІН

## Глядзець на мастацтва шырока расплюшчанымі вачыма прапануе галерэя «Універсітэт культуры»



Апошнім часам у Мінску з'яўляюцца новыя выставачныя пляцоўкі, якія спрабуюць захапіць і прыцягнуць наведнікаў арыгінальнымі мастацкімі праектамі. Пэўныя галерэі зацікаўліваюць інтэр'ерам, у які выйгрышна ўпісваюцца мастацкія творы, ёсць арт-пляцоўкі, якія арыентуюцца толькі на імёны-брэнды айчыннага мастацтва. Мастацкая галерэя «Універсітэт культуры», якой, дарэчы, сёлета спаўняецца пятнаццаць год, актыўна працуе з прадстаўнікамі розных кірункаў творчасці. За апошнія два гады галерэя набыла папулярнасць у гледача: прадстаўнікі айчыннай арт-супольнасці збіраюцца тут, у цэнтры сталіцы, не толькі, каб паглядзець новую выстаўку, але і каб пагутарыць. Як атрымалася прыцягнуць аўдыторыю і чым жыве арт-пляцоўка, расказаў дырэктар галерэі Павел Сапоцька.

**— Павел Міхайлавіч, галерэя «Універсітэт культуры» за апошнія два гады стала адной з самых папулярных арт-пляцовак сталіцы. Як у вас атрымалася дасягнуць такога поспеху?**

— Любы кіраўнік, як і любы супрацоўнік установы культуры, у дадзеным выпадку галерэі, павінен шчыра любіць працу, якой займаецца. І гэта першая ўмова, дзякуючы якой ажыццяўляецца любая дзейнасць. Другая ўмова — неабходна ўсведамляць патрэбу грамадства ў праектах, праграмах, выстаўках, іншых сацыяльна-культурных мерапрыемствах, якія сапраўды запатрабаваныя, цікавыя і могуць вырашаць пэўныя задачы. Трэба ставіць мэту і ісці да яе: займацца папулярызацыяй нацыянальнай традыцыйнай беларускай культуры, трансляцыяй творчых магчымасцяў, патэнцыялу адораных таленавітай моладзі, знаёміць з досведам вядучых дзеячаў сферы культуры і мастацтваў Беларусі.

Кожным сваім праектам мы стараемся вырашыць пэўную задачу — адкрыць новае імя, магчыма, нагадаць пра імёны забытых мастакоў, дапамагчы пераняць досвед старэйшых пакаленняў маладзейшым. У нас неаднаразова нараджаліся ідэі выставак, якія потым трансфармаваліся ў маштабныя праграмы. Напрыклад, праграма «Беларускія таленты ў свеце».

Трэцяя ўмова, дзякуючы якой атрымліваецца зрабіць працу больш эфектыўнай, — кіраўнік павінен усведамляць і разумець, што кожная секунда працоўнага часу, кожны квадратны метр (у нашым выпадку выставачнай прасторы) павінен прыносіць карысць і рабіць унёсак у папулярызацыю нашай вышэйшай навучальнай установы, у прапаганду беларускай культуры, развіццё культурных сувязяў. У дадзеным выпадку можна казаць пра міжкультурны дыялог, пра творчыя кантакты, якія завязваюцца на базе нашай галерэі. Для мяне вялікае шчасце, калі знаёмства гасцей прыводзіць да новых арыгінальных праектаў. І гэта таксама немалаважная функцыя галерэі. Кожнае мерапрыемства павінна ператварацца ў свята зносін. Менавіта таму мы часам выходзім за межы выставачных праектаў і стараемся практыкаваць музычна-літаратурныя вечары, прэзентацыі, творчыя сустрэчы, вечарыны памяці.

**— У Мінску апошнім часам адкрываецца ўсё больш цікавых галерэй і розных арт-прастор. Наколькі адчуваецца канкурэнцыя і як яна адлюстроўваецца ў галерэйнай справе?**

— Сапраўды, канкурэнцыя апошнім часам адчуваецца моцна. І змагацца з гэтым не трэба. На мой погляд, трэба альбо супрацоўнічаць, шукаць пункты ўзаемадзеяння, альбо ўлічваць фармат дзейнасці іншых галерэй, улічваць тыя практыкі, якія ўласцівыя ім, і імкнуцца шукаць свае асаблівасці. Раней у Мінску было ўсяго некалькі галерэй, цяпер жа з'явіліся галерэі-салоны, адкрытыя арт-пляцоўкі, крэатыўныя прасторы. І яны заўсёды будуць канкураваць, нягледзячы на тое, што супрацоўнікі і кіраўнікі могуць быць у сяброўскіх адносінах. Мне здаецца, што толькі ў канкурэнтаздольным асяроддзі нараджаецца нешта цікавае. А гамагеннасць для культуры — страшная з'ява, якой трэба пазбягаць. Хоць для Беларусі гэта з'ява, на жаль, уласціва, асабліва для рэгіёнаў, дзе бывае адзін музей, бібліятэка або галерэя. Калі ў любы беларускі горад, аграгарадок укараніць яшчэ некалькі культурных аб'ектаў, іх эфектыўнасць і разнастайнасць адназначна вырасце, прычым у разы. Таму я вельмі рады, што ў Мінску ўсё ж такі з'яўляецца жывая канкурэнцыя, прычым не толькі паміж арт-пляцоўкамі, але і самімі мастакамі. Галоўнае, каб яна была здаровая, а гэта, дарэчы, не заўсёды так.

Я хаджу на адкрыццё выставак у розныя галерэі і музеі Мінска. З аднаго боку, атрымліваю эстэтычнае задавальненне, з другога — наладжваю даследчую працу, што дапамагае структураваць і сістэматызаваць сваю дзейнасць. Гэта значыць, я бачу, хто і чым займаецца, улічваю магчымасці і нюансы іншых арганізацый і ў выніку знаходжу арыгінальныя шляхі для рэалізацыі праектаў у нашай галерэі. Галоўнае — не паўтарацца. Не трэба саромецца рабіць нестандартныя мерапрыемствы. Напрыклад, мы 22 чэрвеня праводзілі цырымонію ўзнагароджання рэспубліканскага конкурсу «Лепшы горад для бізнесу ў Беларусі». У межах мерапрыемства арганізавалі невялікую выстаўку твораў былых вязняў нацызму. Многія мэры гарадоў, кіраўнікі адміністрацый, якія прысутнічалі на мерапрыемстве, падыходзілі і дзякавалі нашу каманду за магчымасць не проста атрымаць грамату і пайсці дадому, а паглядзець цікавыя мастацкія творы, адчуць унутры духоўнасць. Некаторыя з удзельнікаў таго мерапрыемства прапанавалі нам супрацоўніцтва.

**— Што найбольш эфектыўна ўплывае на піяр галерэі: адкрыццё новых імёнаў альбо, наадварот, праекты, звязаныя з імёнамі знакамітых мастакоў, ці, можа, іншыя стратэгіі?**

— Я за разнастайнасць і шматпрофільнасць. З пазіцыі менеджара і кіраўніка лічу, што ў цяперашніх умовах для нашай галерэі выгадна арганізоўваць працу па розных кірунках і весці некалькі ліній. Асноўная мэта, дзеля якой ствараліся наша галерэя, — падтрымка творчых ініцыятыў адораней і таленавітай моладзі (навучэнцаў, студэнтаў), правядзенне выставак у фармаце «настаўнік і вучань». Аднак калі мы абмяжуемся толькі асноўнай функцыяй, да нас ніхто не прыйдзе. Пэўны досвед ужо ёсць. Калі сёння ў нас адкрыццё выстаўкі таленавітага, але нікому не вядомага дзіцяці, заўтра — заслужанага дзеяча мастацтваў, імя якога — брэнд беларускай культуры, а паслязаўтра мы арганізоўваем літаратурны вечар, тады і зараджаецца цікавасць. Па-першае, цікавасць для нас саміх, па-другое, цікавасць для аўдыторыі: разнастайнасць захоплівае. Ну, і трэцяе (напэўна, адзін з галоўных інтарэсаў да арт-пляцоўкі) — увага сродкаў масавай інфармацыі. Ёсць закон: калі няма на мерапрыемстве СМІ, пра падзею ніхто не даведаецца і на выстаўку не прыйдзе, адпаведна, арганізацыя не была бессэнсоўнай.

Вядома, у мяне як у дырэктара — свае прыярытэты, таму ў «рэпертуары» нашай галерэі будзе не толькі мноства мастацкіх праектаў, але і літаратурныя вечарыны, кніжныя выстаўкі, творчыя сустрэчы. Тым больш кірункі можна сумяшчаць, праводзіць нават у адзін час. Галоўнае — прыцягнуць і зачапіць гледача, паказаць яму, што менавіта ў нашай галерэі ён можа сутыкнуцца з тым, што яму блізка. Трэба вучыцца выходзіць за межы традыцыйнага і вучыцца бачыць мастацтва больш шырока.

**— Ці сутыкаліся вы як малады кіраўнік з крытыкай і як змаглі за два гады даказаць, што ваша прафесійная пазіцыя правільная?**

— У сферы культуры мяне не вельмі ведалі, а кожная галіна гэтай сферы досыць цяжка прымае новых людзей. Нельга сказаць, што я быў не гатовы, але на практыцы давялося складаней, чым у тэорыі. Было шмат нюансаў з мастакамі, затое лёгка ўсталёўваліся кантакты з пасольствамі, грамадскімі аб'яднаннямі. З часам я зразумеў: каб выконваць свае абавязкі якасна і зарэкамендаваць сябе, трэба вучыцца мець зносіны з арт-грамадскасцю, у якую ўваходзяць не толькі мастакі, але і куратары, мастацтвазнаўцы, калекцыянеры ды і наогул усе аматары мастацтва.

Было няпроста, але самы лепшы спосаб — не звяртаць увагу на негатыў. Калі б мы кіраваліся толькі інструкцыямі, якія датычныя працы галерэі, палова добрых праектаў не адбылася б. Я ведаю адно: згодна з правіламі жыць можна, але трэба рабіць у тры разы больш, каб дзейнасць прыносіла плён. Трэба раіцца з калектывам, які кожны дзень сутыкаецца з гэтай працай і ведае, як правільна рэалізоўваць працэс. За час працы я ўсвядоміў: нельга баяцца быць смелым і ініцыятыўным. Гэта дапамагае знаходзіць магчымасці, часам нават тыя, у рамкі якіх, здаецца, выставачная дзейнасць не падпадае. Зараз мы ўдзельнічаем у розных акцыях: у нейкіх выпадках мы партнёры, а дзесьці — арганізатары. Галоўнае — што мы ёсць у кантэксце гэтых праектаў, што фарміруе пазнавальнасць галерэі. Да прыкладу, мерапрыемства, якое прысвечана 500-годдзю беларускага кнігадрукавання і памяці Францыска Скарыны, якое рэалізуецца фондам Міхала Клеафаса Агінскага: тут мы не засталіся ўбаку, з'яўляемся партнёрамі і адказваем за пэўны блок працы: у Кракаве, Празе, Падуі, Фларэнцыі і Бялградзе пройдуць канцэрты і выстаўкі. Мы не пабаяліся паўдзельнічаць у тэндары і падалі заяўку з прапановамі для арганізацыі Дзён еўрапейскай спадчыны. Міністэрства культуры іх падтрымала, і пад эгідай Савета Еўропы мы сёння праводзім гэты праект.

Праца ў галерэі будуецца, як і сістэма адукацыі: ёсць навуковы і тэарэтычны падыходы, якія неабходныя, але калі б у рэчышчы адукацыйнага працэсу не было гастроляў, пленэраў, сустрэч і стажыровак, не было б і выніку.

**— Ці магчыма зарабляць грошы на галерэйнай справе?**

— Наша галерэя па заканадаўстве не можа зарабляць грошы для сябе, але дапамагае ў гэтым людзям, якія арганізоўваюць на нашай пляцоўцы праекты. Ёсць шмат прыкладаў. Першы — выстаўка гжэлі, якая адбылася ў 2016 годзе. Наведвальнікі зацікавіліся і набылі шмат твораў у аўтараў. Нашы гледачы актыўна набываюць творы дзяцей — навучэнцаў беларускай школы мастацтваў. Ёсць і іншыя прыклады дапамогі талентам: у нашай галерэі намеснік міністра інфармацыі Алесь Карлюкевіч убачыў творы маладой мастачкі Дзіяны Каласовіч і прапанаваў ёй зрабіць жывапісныя творы помнікаў культуры для кнігі, якую рыхтуе адно з беларускіх выдавецтваў. Былі выпадкі, калі прадстаўнікі іншых музеяў і галерэй тэлефанавалі нам і прасілі кантакты, каб выставіць працы творцаў, якія экспанаваліся на нашай пляцоўцы.

**— У Дзіяны Каласовіч была першая выстаўка, пасля пра яе загаварылі ўсе навокал. Гэта выпадковасць ці сапраўды галерэя дапамагла маладой мастачцы сфарміраваць імідж? Ці былі яшчэ такія выпадкі?**

— Дакладна не выпадковасць. Раней Дзіяна ўдзельнічала ў калектыўных выстаўках, дзе сярод вялікай колькасці работ, напэўна, было складана вылучыцца. Персанальная выстаўка, калі цэнтральная — асоба аўтара, — гэта свята, у выпадку з Дзіянай усё сышлося: яе талент і ўнутраная цеплыня неверагодна ўразілі гледачоў. Асабліва, калі ўлічыць той факт, што гэта быў час адпачынкаў. Але творы глядзелі і маглі стаяць каля іх гадзінамі — настолькі моцная энергетыка ў аўтара. Галерэя дапамагла Дзіяне зрабіць крок наперад.

Падобныя выпадкі былі. Напрыклад, выстаўка пясочнай графікі: майстры былі ўражаны, наколькі беларусы зацікавіліся гэтым відам мастацтва. Яны казалі, што аб'ездзілі паўсвету са сваімі творамі, але такой цікавасці да сабе не адчувалі ні разу. У гэтым выпадку мы зрабілі правільны піяр. Мы не пазіцыянавалі пясочную графіку як забаву, а паказалі яе як мастацтва, шматграннае і новае для нашай тэрыторыі.

Бывала і так, што праз праекты адкрывалася асоба куратара, а не мастака. Гледачы заўважалі, наколькі правільна выбраны падыход і канцэпцыя праекта, глядзелі на экспазіцыю, і куратар для іх станавіўся галоўным героем вечара, як, напрыклад, адбылося з мастацтвазнаўцай Аксінняй Сяліцкай.

**— Ці развітая ў Беларусі галерэйная справа, як на вашу думку?**

— Мне здаецца, што ў поўнай меры яшчэ не развітая, ёсць куды рухацца. У нас заўсёды будуць добра працаваць галерэі і музеі са статусам нацыянальных альбо тыя, што знаходзяцца пад уладай універсітэтаў. Цяпер у Мінску многа галерэй-салонаў, але, як правіла, яны збіраюць свае кола, і пра іх мала хто ведае. Справа ў тым, што галерэя ў класічным варыянце працы павінна зарабляць грошы, а ў нашых умовах гэта рабіць складана. Дастаткова ўспомніць «Дом карцін», некаторы час адну з папулярных выставачных пляцовак у Мінску, а сёння галерэя зачынена: фінансавы бок адыграў тут немалаважную ролю.

Але галерэй нашага тыпу гэта не тычыцца: мы павінны выконваць асветніцкую задачу, і таму аўдыторыя ў нас больш шырокая (не толькі дарослае пакаленне, але і дзеці).

Калі ў краіне, асабліва ў сталіцы, адкрываецца новая галерэя, трэба канкрэтна разумець, для чаго яна, ці мае яе існаванне сэнс. У нас многа таленавітых людзей, культура рухаецца далей, таму і галерэйная справа будзе так ці інакш развівацца.

**Вікторыя АСКЕРА, фота аўтара**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ